Радыё Свабода

ВЫБАРЫ-2020

«Вы нам пагражаеце?» Як ва ўстанове Кіраўніцтва спраў прэзыдэнта зьбіралі подпісы за Лукашэнку (аўдыё)

05 чэрвень 2020, 16:42

Іна Студзінская

У Палацы Рэспублікі прымусова і ў працоўны час зьбіралі подпісы за Лукашэнку. Паводле дырэктара Палаца, зьбіраў подпісы намесьнік старшыні прафкаму з уласнай ініцыятывы. Праведзены разбор, ініцыятар збору подпісаў звольнены, перад супрацоўнікамі выбачыліся.

Радыё Свабода атрымала аўдыёзапіс сходу ў Палацы Рэспублікі, дзе ў працоўны час ідзе збор подпісаў за Аляксандра Лукашэнку. Паводле словаў зборшчыка, ён «выконвае распараджэньне дырэктара».

> УЖЫВУЮ Выбары-2020. Як праходзіць прэзыдэнцкая кампанія падчас пандэміі

«Хто ня памятае свае пашпартныя дадзеныя, яны ёсьць у аддзеле кадраў»

На аўдыёстужцы, якую даслалі на Свабоду, мужчынскі голас ставіць задачу: «Кожны з вас павінен унесьці дадзеныя, паставіць подпіс, каб гэтыя сьпісы аддаць ва Ўпраўленьне спраў адміністрацыі прэзыдэнта. Каб паказаць, што ў нас самая шматлікая служба патрыётаў у Рэспублікі Беларусь».

На стужцы чуваць пярэчаньні: «Вы пасьведчаньне на права збору подпісаў маеце?», «Кажуць, у працоўны час гэта нельга рабіць, толькі ў вольны», «Гэта парушэньне закону».

На гэтыя рэплікі мужчына адказвае: «Я выконваю распараджэньне дырэктара. Таму, калі нейкія пытаньні да мяне, я перанакіроўваю вас да дырэктара». «Хто ня памятае свае пашпартныя дадзеныя, яны ёсьць у аддзеле кадраў».

Раздаюцца воклічы: «Гэта што, прымусова?» «Я наагул не хачу нідзе ўдзельнічаць».

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
«Прыйшлі з ужо гатовымі падпіснымі аркушамі». Людзі скардзяцца, што прымушаюць падпісвацца за Лукашэнку

«Добра, ты вольны. Але памятайце: вы працуеце ў арганізацыі, падпарадкаванай Кіраўніцтву спраў адміністрацыі прэзыдэнта».

«Вы нам пагражаеце?» — пытаюцца жанчыны. Ідзе слоўная перапалка. Потым жартачкі: «А асадку дасьцё?» — «Нават налью, дадзеныя пашпарта ёсьць» — адказвае зборшчык подпісаў.

«Безь мяне мяне ажанілі»

На аўдыёстужцы выразна чуваць прозьвішчы: Літоўчанка, Мастоўскі...

Ірына Літоўчанка працуе начальнікам службы пастановачнага асьвятленьня. Свабода датэлефанавалася ёй. Ірына Паўлаўна сьцьвярджае, што яе на гэтым сходзе не было. Чаму там гучала яе прозьвішча, жанчына ня ведае.

«Можа, хтосьці кагосьці і зьбіраў. Але мяне там дакладна не было. „Безь мяне мяне ажанілі“», — жартуе Ірына Літоўчанка.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
«Гэтае відэа можна накіраваць у пракуратуру і ЦВК». Што адбываецца на відэа з Рэчыцкай паліклінікі, дзе зьбіраюць подпісы за Лукашэнку?

«Цяпер наагул мала людзей на працы, многія сышлі ў адпачынкі за свой кошт з прычыны каранавірусу і адмены канцэртаў ды іншых масавых мерапрыемстваў. На плянэркі зьбіраемся ў Малой залі, сядаем на адлегласьці адзін ад аднаго», — кажа спадарыня Літоўчанка.

Дырэктар Палаца Рэспублікі: «Для мяне непрыемная гэтая гісторыя»

Дырэктар Палаца Рэспублікі **Максім Прыхадоўскі** спачатку доўга тлумачыў, што ў ягонай установе няма ініцыятыўных груп ніякіх кандыдатаў. А паставіць подпіс за таго ці іншага кандыдата — гэта асабістая справа і права кожнага.

«Ніякімі прымусамі мы не займаемся, а займаемся арганізацыяй канцэртаў і відовішчных мерапрыемстваў, на працоўных месцах людзі павінны займацца працай», — кажа спадар Прыхадоўскі.

Што да канкрэтнага выпадку, які здарыўся ў Палацы Рэспублікі, Максім Анатолевіч усё ж аказаўся «ў курсе».

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Двое магілёўцаў «адклікалі» подпісы за Лукашэнку — заявілі, што зьбіралі пад пагрозамі

«Я разумею, пра што вы кажаце. Мы правялі разбор, гэты чалавек ужо звольніўся. Ён быў намесьнікам кіраўніка прафсаюзаў, сам сабраў людзей — гэта была ягоная асабістая ініцыятыва, а не ўказаньне зьверху. Ён чалавек старой фармацыі: „Мы падтрымліваем“, і ўсё ў такім духу. Для мяне непрыемная гэтая гісторыя.

Што тычыцца супрацоўнікаў, якія прысутнічалі, я асабіста зь імі сустракаўся і прынёс ім выбачэньні», — сказаў дырэктар Палаца Рэспублікі.

Ініцыятар збору подпісаў ужо звольнены — па ўласным жаданьні, паведаміў дырэктар.

«Не было адміністрацыйнага звальненьня, чалавек на пэнсіі. Ніякіх захадаў да яго не ўжывалі. Ён звольніўся па ўласным жаданьні», — запэўніў Свабоду дырэктар Палаца Рэспублікі.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Кіраўнік ініцыятыўнай групы Лукашэнкі адказаў на скаргі аб прымусовым зборы подпісаў

На пытаньне, куды падзеліся подпісы, якія сабраў былы намесьнік старшыні прафкаму, Максім Прыхадоўскі адказаў так:

«Я мяркую, нікуды подпісы не пайшлі. Удакладню гэтае пытаньне».

Старшыня прафкаму Палаца Рэспублікі **Лілія Шыкер** сказала Свабодзе, што яна першы раз чуе, што быў такі сход па зборы подпісаў. І дадала, што намесьніца ў яе жанчына, а ўсяго ў прафсаюзным камітэце 11 чалавек. Па голасе яна быццам бы нікога не апазнала.

Лідэрка прафсаюзу паабяцала ў панядзелак сабраць паседжаньне прафкаму.

Свабода ўсё ж спадзяецца высьветліць, што за чалавек зьбіраў подпісы ў працоўным калектыве Палаца Рэспублікі.

Прэзыдэнцкія выбары — 2020 у Беларусі. Што важна ведаць

- Шостыя ў гісторыі сувэрэннай Беларусі выбары прэзыдэнта прызначаныя на нядзелю, **9 жніўня 2020 году**.
- 65-гадовы **Аляксандар Лукашэнка** кіруе дзяржавай 25 гадоў. Ніводныя прэзыдэнцкія выбары (2001, 2006, 2010, 2015), апроч першых (1994 год), не прызналі свабоднымі і справядлівымі на міжнародным узроўні.
- Старшыня ЦВК **Лідзія Ярмошына** адхіліла прапановы праваабаронцаў аб дыстанцыйных прэзыдэнцкіх выбарах у час эпідэміі COVID-19, бо «часу для прыняцьця гэтых захадаў ужо няма». Лукашэнка ня бачыў падставаў пераносіць выбары праз пандэмію.

- ЦВК зарэгістраваў 15 ініцыятыўных груп з 55 заявак.
- Аўтару YouTube-канала «Страна для жизни» **Сяргею Ціханоўскаму** Цэнтральная выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, бо ён адбываў 15 сутак арышту і ня мог асабіста падаць дакумэнты. Тады сваю ініцыятыўную групу ў ЦВК заявіла жонка блогера **Сьвятлана Ціханоўская**.
- 29 траўня на перадвыбарчым пікеце жонкі затрымалі Ціханоўскага і яшчэ 9 чалавек. Лукашэнка казаў пра акалічнасьці затрыманьня за 4 гадзіны да таго, як яно адбылося.
- 11 чэрвеня ў «Белгазпрамбанку» і шэрагу іншых кампаній прайшлі ператрусы. У Камітэце дзяржкантролю заявілі, што завялі крымінальныя справы аб легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, і аб ухіленьні ад сплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Старшыня КДК **Іван Тэртэль** сьцьвярджаў, што да гэтых спраў мае дачыненьне патэнцыйны кандыдат у прэзыдэнты **Віктар Бабарыка**. Роўна за 4 гадзіны да заявы Дзяржкантролю **Аляксандар Лукашэнка** расказаў пра акалічнасьці «справы „Белгазпрамбанку“».
- 18 чэрвеня Віктара Бабарыку і яго сына, кіраўніка ініцыятыўнай групы Эдуарда Бабарыку затрымалі.
- 14 ліпеня ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі ў прэзыдэнты **Аляксандра Лукашэнку**, **Сьвятлану Ціханоўскую**, **Ганну Канапацкую**, **Андрэя Дзьмітрыева** і **Сяргея Чэрачня**. Не зарэгістравалі **Віктара Бабарыку** і **Валера Цапкалу**.
- Ад пачатку выбарчай кампаніі праваабаронцы налічылі больш за 1300 затрыманых: удзельнікі «ланцугоў салідарнасьці», сябры ініцыятыўных груп, актывісты, палітыкі, блогеры, журналісты і проста мінакі на вуліцы. Сотні чалавек пакаралі адміністрацыйнымі арыштамі і аштрафавалі.